**УДК 34.947.6**

# ЛІБЕРАЛЬНАЯ ДУМКА Ў ВІЛЕНСКІМ УНІВЕРСІТЭЦЕ Ў ПАЧАТКУ XIX СТАГОДДЗЯ

***д-р гіст. навук, праф. І.А. БАСЮК***
***(Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы)***

*Разгледжаны ўзнікненне і развіццё ліберальнай думкі ў Віленскім універсітэце ў пачатку XIX стагоддзя. Раскрыты мэты і праграмныя задачы першых у Беларусі ліберальных арганізацый – тайных студэнцкіх таварыстваў філаматаў, якія дзейнічалі ў Віленскім універсітэце ў 1817–1823 гадах. У першым перыядзе (1817–1818) філаматы ставілі перад сабою галоўнымі культурна-асветніцкія задачы, паглыбленае вывучэнне навук і маральнае ўдасканальванне асобы. У другім перыядзе (1818–1823) у філаматаў з'явіліся палітычныя ідэі, яны асуджалі дэспатызм (самадзяржаўе), прыгоннае права, выступалі за вызваленне сялян. Шчасце чалавека філаматы разумелі як дыялектычную ўзаемасувязь грамадскіх і асабістых інтарэсаў, як службу Айчыне. Будучае Беларусі бачылі ў межах Рэчы Паспалітай (да першага яе падзелу). Як прадстаўнікі ліберальнага напрамку дасягненне сваіх мэтаў і задач філаматы звязвалі з маральным удасканальваннем асобы праз развіццё навукі, асветы і выхавання.*

***Ключавыя словы:*** *лібералізм, тайныя таварыствы, права, свабода, дэспатызм, асоба, прыгоннае права, Рэч Паспалітая.*

Лібералізм (ад лац. liberalis – свабодны) – гэта філасофская і грамадска-палітычная плынь, якая ўзнікла як рэакцыя на злоўжыванне ўладай абсалютных манархаў. Заснавальнікамі класічнага лібералізму былі Дж. Лок, А. Сміт (Вялікабрытанія), Мантаск'ё, Ф. Гізо (Францыя), І. Кант (Германія), Т. Джэферсан, Б. Франклін (ЗША), А.М. Радзішчаў (Расія) і іншыя. Лібералы не прызнавалі боскага паходжання ўлады манархаў, прызнавалі асобу, яе свабоды і магчымасць самарэалізацыі найвышэйшай каштоўнасцю і ўмовай развіцця грамадства. У юрыдычных адносінах прынцыпамі лібералізму абвяшчаліся вяршэнства закона і роўнасць грамадзян перад законам, незалежна ад іх грамадскага становішча. З канца XVIII стагоддзя лібералізм стаў адной з вядучых ідэалогій амаль усіх уплывовых краін Еўропы.

Ідэі лібералізму былі ўспрыняты і ў Беларусі. У пачатку XIX стагоддзя ліберальная думка на Беларусі была скіравана на вырашэнне сацыяльна-палітычных праблем рэфармавання сістэмы сярэдняй і вышэйшай адукацыі, на аднаўленне страчанай дзяржаўнасці, на адмену прыгоннага права, на паказ дэспатызму (самадзяржаўя) як галоўнай перашкоды грамадскага прагрэсу.

У беларускай гістарыяграфіі няма ніводнай манаграфіі, спецыяльна прысвечанай ліберальнай думцы ў Віленскім універсітэце. Погляды прыхільнікаў лібералізму толькі фрагментарна адлюстраваны ў навуковых працах Н.М. Махнач, В.Ф. Шалькевіча, В.В Шведа і іншых, у вучэбнай літаратуры, у прыватнасці ў навучальных дапаможніках па курсу «Гісторыя дзяржавы і права Беларусі», у энцыклапедычных выданнях.

Але погляды лібералаў на грамадства, беларускую дзяржаўнасць, на права, функцыі ўрада, на абавязкі і правы грамадзян, на закон, мараль і сёння слаба адлюстраваны ў навуковай айчыннай літаратуры. На запаўненне ў нейкай меры азначаных вышэй прабелаў і скіраваны артыкул.

**Асноўная частка.** На Беларусі ліберальная думка пачала складвацца з канца XVIII – пачатку XIX стагоддзя. *Асяродкам* ліберальнай думкі быў *Віленскі ўніверсітэт*, духоўны і навуковы цэнтр Беларусі. Універсітэт быў заснаваны ў 1803 годзе, ён меў факультэты маральных і палітычных навук, фізіка-матэматычны, медыцынскі, літаратурны і вольных мастацтваў. Выкладалі ва ўніверсітэце 34 прафесары [1, с. 287], сярод якіх былі М. Баброўскі, І. Даніловіч, І. Лялевель, Т. Чацкі і іншыя. Універсітэт падтрымліваў навуковыя сувязі з Расійскай Акадэміяй навук, з Маскоўскім, Казанскім, Варшаўскім, Кракаўскім і іншымі ўніверсітэтамі [1, с. 288]. Адукацыя, атрыманая ў Віленскім універсітэце, не саступала той, якую давалі лепшыя тагачасныя ўніверсітэты Заходняй Еўропы. У пачатку XIX стагоддзя ва ўніверсітэце навучаліся 256 студэнтаў (шляхціцаў – 167 чалавек, мяшчан – 79, разначынцаў – 10) [2]. Са сцен універсітэта выйшлі вядомыя паэты і пісьменнікі: А. Міцкевіч, Ю. Славацкі, Ю Крашэўскі, гісторык І. Даніловіч, урачы А. Бекю, В. Гіндэнбург, геолаг І. Дамейка і іншыя. Менавіта ва ўніверсітэце былі ўспрыняты еўрапейскія ідэі лібералізму, прыхільнікамі ліберальных ідэй сталі яго некаторыя выкладчыкі і студэнты.

Ва ўніверсітэце ў 1817 годзе было створана тайнае Таварыства філаматаў (філаматы (ад грэч. philomathes – аматар ведаў), у якое ўвайшлі Ян Чачот, Тамаш Зан, Восіп Кавалеўскі, сын рэктара ўніверсітэта Францішак Малеўскі і іншыя (усяго 21 чалавек) [3] і якое існавала да 1823 года. Прэзідэнтам філаматаў на працягу 6 гадоў (1817–1823) быў *Юзаф Яжоўскі*. Дакладных звестак пра яго паходжанне і месца нараджэння няма. Вядома, што ён вучыўся ў Віленскім універсітэце, займаўся філасофіяй і філалогіяй, асновай яго светапогляду была філасофія І. Канта. На пасяджэннях таварыства ён выступаў з навуковымі паведамленнямі і перакладамі з твораў старажытных аўтараў. Ставіў задачу выхавання ўсебакова развітой асобы, высокай грамадзянскасці і патрыятызму.

Актыўным удзельнікам суполкі філаматаў быў *Ян Чачот*, які нарадзіўся на Навагрудчыне, вучыўся ў Навагрудскай дамініканскай школе, дзе зблізіўся і на ўсё жыццё пасябраваў з Адамам Міцкевічам. У 1815 годзе Ян паступіў на аддзяленне маральных і палітычных навук Віленскага ўніверсітэта, але не маючы сродкаў на аплату за навучанне, праз год пакінуў вучобу і ўладкаваўся ў Віленскае бюро па ўпарадкаванні архіваў князёў Радзівілаў. Аднак душой Чачот назаўсёды застаўся з універсітэцкімі сябрамі, у 1818 годзе ён становіцца членам філаматаў. Пісаў вершы на беларускай і польскай мовах, якія карысталіся вялікім поспехам. У вершах заклікаў паважаць простага мужыка, крытыкаваў жорсткасць паноў, выказваўся за адмену прыгоннага права. Мы ў сваім артыкуле будзем часта цытаваць творы Яна Чачота, бо яго думкі, разважанні, трапныя заўвагі, крытычныя выказванні дапамогуць усвядоміць светапогляд філаматаў, структуру, мэты і задачы гэтай студэнцкай тайнай суполкі.

Спярша ў Віленскім універсітэце наглядалася недаацэнка гуманітарных навук. «Ва ўніверсітэце…, – адзначаў Ян Чачот, – так патрэбныя чыноўнікам і грамадзянам навукі права і адміністрацыі ляжаць у нас аблогай» [4, с. 643] (*Аблога* – даўно не аранае поле, пакрытае травою, дзірваном – *І. Б.*). Прэзідэнт суполкі Яжоўскі неаднаразова падкрэсліваў, што для членаў таварыства асабліва актуальнымі павінны быць не прыродазнаўчыя, а гісторыка-філасофскія навукі, бо толькі яны могуць дапамагчы выявіць прычыны, якія прыводзяць да дэспатызму, вызначыць сродкі, накіраваныя на яго знішчэнне.

Філаматам патрабавалася сфармуляваць свае мэты, арганізацыйныя асновы, правы і абавязкі членаў суполкі, прынцыпы ўзаемаадносін з іншымі грамадскімі таварыствамі. Гэтыя задачы вырашаліся прыняццем статута, таму філаматы прыклалі шмат намаганняў для яго распрацоўкі. Спярша праект статута распрацоўвалі Адам Міцкевіч і Тамаш Зан з арыентацыяй на аб’яднанне значнай колькасці моладзі. Але ўлічваючы рэаліі Расійскай імперыіі, ад прыцягнення значнай колькасці моладзі ў тайную суполку прышлося адмовіцца. Быў прыняты праект статута Юзафа Яжоўскага, які прадугледжваў стварэнне вузкага, фактычна закрытага таварыства з абмежаванай колькасцю ўдзельнікаў. Галоўнай мэтай філаматы лічылі падрыхтоўку моладзі да рознабаковай дзейнасці на карысць Айчыны. Статут абавязваў сваіх членаў авалодваць навуковымі ведамі, замежнымі мовамі, займацца творчасцю. Філаматы трактавалі веды і навуку як найвышэйшыя каштоўнасці чалавека, выступалі супраць абмежавання іх культурна-асветніцкіх функцый. Сацыяльныя заганы філаматамі трактаваліся з пункту гледжання канцэпцыі натуральнага права, яны асуджалі дэспатызм, прыгонніцтва, феадальна-абсалютысцкія парадкі. Лічылі, што асноўная задача моладзі – набыццё ведаў аб прызначэнні чалавека і яго маральна-грамадскай сутнасці. Філаматы крытыкавалі індывідуалізм, адкідалі эгаістычную мараль. У 1819 годзе Адам Міцкевіч пісаў:

*Пускай к нам не ведают входа*
*Обманы, предательство, лесть;*
*Здесь чтится высоко свобода,*
*Отчизна, наука и честь* [5, с. 26].

Асноўнымі пунктамі праграмы філаматаў было патрабаванне адмены прыгоннага права і шырокае распаўсюджванне асветы; свабода сялянства лічылася асновай дабрабыту і прагрэсу грамадства. Вырашэнне галоўных грамадска-палітычных супярэчнасцей філаматы разглядалі як залежнае ад палітычнай улады і суадносілі яго з вырашэннем маральных праблем; маральнае зло лічылі асновай любой несправядлівасці сацыяльнага жыцця.

У *арганізацыйным плане* філаматы імкнуліся да структурнай дасканаласці сваёй дзейнасці. Гэта знайшло адлюстраванне ў 3-х варыянтах статута філаматаў (прымаліся адпаведна ў 1817, 1818 і 1819 гг.). Першы статут Юзэфа Яжоўскага падзяляў філаматаў на праведзеных членаў арганізацыі і членаў-карэспандэнтаў, куды залічаліся навічкі (мелі права толькі на навуковую дзейнасць і не дапускаліся на сходы). Паводле другога статута суполка падзялялася на аддзелы: свабодных навук і літаратуры, фізіка-матэматычных і медыцынскіх навук. Трэці статут фармальна скасаваў інстытут членаў-карэспандэнтаў, але захаваў абавязковы 4-месячны выпрабавальны тэрмін для новых кандыдатаў [6, с. 34]. «Што да адбору членаў, – адзначаў Ян Чачот, – то тут трэба б нам паболей строгасці – каб у таварыства прымаліся толькі сапраўды годныя людзі, дзейныя, з высакародным сэрцам, разумныя, людзі, якія любяць айчыну, старанныя і цвёрдыя…» [4, с. 641]. Пасля заканчэння ўніверсітэта філаматы марылі працаваць настаўнікамі, каб несці ў народ навуковыя веды і польскую культуру. Філаматы асуджалі гультаёў, асобаў, якія не паважаюць працу і не хочуць працаваць. Чалавек, «…нічым не праявіўшы сябе, – адзначаў Ян Чачот, – не мог быць і філаматам…» [4, с. 641]. Вядомы факт, калі за бяздзейнасць Б. Сухецкі і В. Палюшынскі былі выключаны з суполкі філаматаў [3].

У *ідэйным* развіцці філаматаў можна вылучыць *два этапы*: *першы этап* – з 1817 па 1818 год. На гэтым этапе пераважалі культурна-асветніцкія задачы, скіраваныя на паглыбленае авалоданне навуковымі ведамі і на маральнае ўдасканаленне; *другі этап* – з 1818 па 1823 год, у філаматаў з’яўляюцца *палітычныя* ідэі, асабліва з паяўленнем арганізацыі *прамяністых. Прамяністыя* (Таварыства сяброў карыснай забавы) – легальная патрыятычная арганізацыя студэнтаў Віленскага ўніверсітэта, існавала ў красавіку – чэрвені 1820 года. Заснавана Тамашом Занам, які нарадзіўся ў 1796 годзе ў беларускай

шляхецкай сям’і. У 1815 годзе ён паступіў на фізіка-матэматычны факультэт Віленскага ўніверсітэта. Чалавек надзвычайнай сілы волі і душэўнай чысціні, Зан карыстаўся вялікай павагай сярод студэнтаў і выкладчыкаў, быў кумірам моладзі. Галоўнай мэтай свайго жыцця лічыў падрыхтоўку моладзі да рашучай бітвы з царскім самаўладдзем за вызваленне роднай Беларусі ад дэспатызму.

Кіраўніцтва прамяністымі ажыццяўлялі філаматы. Статут «15 правіл паводзін для моладзі», складзены Юзэфам Яжоўскім, быў зацверджаны 3 чэрвеня 1820 года рэктарам Віленскага ўніверсітэта Ш. Малеўскім. Паводле статута мэтай Прамяністых было далучэнне моладзі да навукі, добрых паводзін, падтрымка роднай мовы, літаратуры, гісторыі. Колькасць прамяністых дасягала 200–300 чалавек [7, с. 564]. Яны падзяляліся на 7 аддзяленняў, або ваяводстваў (па колькасці колераў вясёлкі – зялёнае, белае, блакітнае і г.д.), са сваімі канцылярыямі, чыноўнікамі: вялікі маршалак сачыў за парадкам на пасяджэннях і абвяшчаў прыгаворы, маршалак надворны закупляў на маёўкі харчаванне, меліся стольнікі, лоўчыя, ваяводы і іншыя чыны па традыцыі былой Рэчы Паспалітай [7, с. 564]. Дзейнасць Прамяністых выклікала нездавальненне царскіх уладаў і кіраўніцтва Віленскага ўніверсітэта, і ў чэрвені 1820 года суполка была забаронена. Пасля забароны легальнай суполкі частка былых прамяністых увашла ў нелегальнае студэнцкае таварыства філарэтаў.

*Філарэты* (ад грэчаскага *philaretos* – аматар дабрадзейнасці), канспіратыўнае таварыства студэнцкай моладзі ў Вільні ў 1820–1823 гадах, якое было створана ў складзе філаматаў, у жніўні 1822 года яно налічвала 215 чалавек [6, с. 35]. Прэзідэнт – Тамаш Зан. Іх мэты – раскрыццё сапраўднага прызначэння навуковай дзейнасці, барацьба з адсталымі поглядамі ў розных слаях грамадства, фарміраванне школы паўнацэннага духоўнага выхавання моладзі. Паводле статута філарэты падзяляліся на 4 групы: фізікаматыматычную, маральную, літаратурную і медыцынскую. Кожная група налічвала больш за 20 чалавек, для астатніх ствараліся гурткі – ружовы, зялёны, малінавы, белы, блакітны, сіні. Навуковая дзейнасць філарэтаў заключалася ў перакладах, напісанні ўласных твораў, перапісцы з сябрамі [6, с. 35].

Грамадска-палітычныя і прававыя погляды філаматаў і філарэтаў змяняліся з часам, па меры асэнсавання імі грамадскіх, палітычных і прававых рэалій і супярэчнасцей, якія склаліся на той час у Расійскай імперыі. Філаматы імкнуліся пазбягаць абстрактных філасофскіх разважанняў, яны спрабавалі знайсці адказы на відавочныя выклікі грамадскага жыцця. «Адкрытая ісціна, – пісаў Тамаш Зан, – павінна мець блізкую сувязь з прасторай і часам, а таксама з той выгадай, якую дае яе прымяненне…» (цыт. па [8, с. 48]).

Філаматы лічылі, што шчасце чалавека патрэбна шукаць менавіта ва ўзаемасувязі грамадскага і асабістага. «Шчасце, – адзначаў Ян Чачот, – гэта найвышэйшая мэта ўсіх імкненняў чалавека; шчасце ва ўнутранай задаволенасці ад сваёй працы, учынкаў і побыту; шчасце – у шчасці грамадскім: дбаць пра грамадскае дабро – значыць памнажаць і дабро ўласнае» [4, с. 642]. Імкненне разглядаць усе пытанні грамадскага і дзяржаўнага жыцця праз прызму маралі – характэрная рыса светапогляду філаматаў.

У аснову светапогляду філаматаў і філарэтаў была пакладзена катэгорыя *свабоды*. Спярша філаматы ўяўлялі свабоду як магчымасць удасканалення асобы ў галіне маралі і навукі. Затым катэгорыя «свабоды» набыла ў філаматаў больш акрэслены змест: свабода процістаўляецца ўсякім сацыяльным перашкодам – дэспатызму, гвалту, прыгнёту і г.д. У праграме філаматаў было запісана: «Пакуль не будзе знішчана ганебнейшая... перашкода – няволя сялян, праціўная натуральнаму праву, цвярозаму розуму, нельга гаварыць аб грамадскім прагрэсе» [9]. Прыгоннае права філаматы лічылі галоўнай перашкодай для рэформаў. «Ні асвета краю, ні земляробства не можа больш хуткімі тэмпамі рухацца наперад, пакуль не будзе ліквідавана ганебная, замшэлая на працягу вякоў і аброслая забабонамі перашкода – няволя сялян, – адзначаў Ян Чачот, – якая супярэчыць законам прыроды, цвярозаму розуму і нават чыста эканамічным разлікам і выклікае сорам у сэрцах людзей…» [4, с. 646].

Новае грамадства, сцвярджалі філаматы, магчыма стварыць толькі на прынцыпах натуральнага права, якое яны разумелі як навуку аб адносінах паміж людзьмі; людзі ў новым грамадстве павінны быць роўнымі і свабоднымі [10, с. 249].

Перашкодай для грамадскага прагрэсу філаматы і філарэты лічылі дэспатызм (самадзяржаўе). На думку філаматаў, найлепшай формай дзяржаўнага кіравання была канстытуцыйная форма. Адам Міцкевіч у сваім вершы «*Песнь филаретов*» (1820 г.) так выказаў канстытуцыйныя імкненні сваіх аднадумцаў – філаматаў і філарэтаў:

*Вот там юристы сели.*
*И им бокал поставь:*
*Сегодня – право силы,*
*А завтра – сила прав* [5, с. 30].

Звернем увагу на апошнія два радкі верша: «Сегодня – право силы» (*самадзяржаўе*), «а завтра – сила прав» (*канстытуцыя*).

Стан грамадства філаматы звязвалі з формай дзяржаўнага кіравання. «Найлепшы ўрад будзе там, – адзначаў Ян Чачот, – дзе ўсё робіцца згодна з пажаданнем народа, а не з волі, капрызу і сілы аднаго» [4, с. 644]. Пры гэтым філаматы і філарэты бачылі дыялектычную ўзаемасувязь урада і грамадзян. «Не могуць быць

добрымі грамадзяне там, – адзначаў Ян Чачот, – дзе кепскі ўрад, і не можа быць кепскага ўрада там, дзе большасць – добрыя грамадзяне» [4, с. 644]. Грамадзяне, на думку філаматаў, павінны дбаць пра грамадскія справы, служыць грамадству, клапаціцца аб яго справах. «Хто дбае пра грамадскае дабро, інакш кажучы пра шчасце, асвету і славу краю, – адзначаў Ян Чачот, – хто рады прысвяціць яму самога сябе, аддаць яму ўсе здольнасці, сілы і маёмасць – з'яўляецца сапраўдным грамадзянінам» [4, с. 642].

Філаматы не ставілі пытання аб нацыянальна-дзяржаўным самавызначэнні Беларусі, яны выступалі за адраджэнне Рэчы Паспалітай. На той час інакш і не магло быць, бо філаматы і філарэты дзейнічалі ў першы перыяд беларускага вызваленчага руху, калі вызваленчы рух характарызаваўся як *«рух у сабе»*, ці *«пачатковы падсвядомы рух»*. У гэты перыяд у тагачаснай грамадскай свядомасці беларускае нацыянальнае пытанне разглядалася пераважна ў межах *польскага* вызваленчага руху за аднаўленне граніц Рэчы Паспалітай 1772 года (да першага падзелу) [11]. Аб гэтым сведчаць і самі філаматы, і філарэты. На пасяджэнні следчай камісіі філарэт Янкоўскі заявіў, што акрамя навукі галоўнейшай мэтай суполкі было ўз'яднанне агульных сіл «чтобы восстановить Польшу в прежнем её блеске» [10, с. 250].

Змяненні грамадска-палітычных поглядаў філаматаў і філарэтаў можна прасачыць па вершах Адама Міцкевіча віленскага перыяду.

У кастрычніку 1819 года А. Міцкевіч пісаў:

*Дойдем мы, хоть трудной дорогой,*
*До счастья, когда подадут*
*Все руки друг другу. Помогут*
*Нам смелость, согласье и труд!* [5, с. 26].

У снежні 1820 года ў вядомай «Оде к молодости» Адам Міцкевіч ужо заклікае моладзь да барацьбы:

*Друзья младые! Вставайте разом!*
*Счастье всех – наша цель и дело.*
*В единстве мощь, в упоенье разум.*
*Друзья младые! Вставайте смело!*
*На силу силой, друзья ответим,*
*А слабость сломим в юности ранней!* [5, с. 28].

Важную ролю ў жыцці грамадства філаматы і філарэты адводзілі праву, законам, сумленню, маралі. «Сапраўдны грамадзянін паводзіць сябе не толькі згодна ўстаноўленым грамадскім законам, – адзначаў Ян Чачот, – але і згодна законам сумлення, маралі і рэлігіі…» [4, с. 642]. Філаматам быў і студэнт-юрыст Адынец Антон, ураджэнец Ашмяншчыны, які ў 1820–1823 гадах вучыўся на аддзяленні права Віленскага ўніверсіта [3].

У 1823 годзе на класнай дошцы ў Віленскім універсітэце з'явіўся надпіс: *«Няхай жыве Канстытуцыя 3 мая»*. Гэта быў заклік да адраджэння Рэчы Паспалітай і яе Канстытуцыі 1791 года. Улады пачалі расследаванне, у ходзе якога выкрылі тайныя студэнцкія суполкі філаматаў і філарэтаў. З верасня 1823 года пачалося следства, у ходзе якога, па сведчанні І.Н. Лабойка, «взяли до 100 человек, …Многие …были уже женатыми или служили в отдаленных губерниях… и совершенно забыли они, что, быв студентами, принадлежали к обществу филаретов, и, будучи содержимы в заключении, никак не могли понять, по какой причине постигла их эта жестокая судьба» [12]. Следства працягвалася 11 месяцаў. У маі 1823 года быў аб'яўлены прыгавор, падпісаны Аляксандрам І, у якім гаварылася, што «за распространение безрассудного польского национализма посредством науки» частка філарэтаў і філаматаў высылаліся ва ўнутраныя губерні Расіі, іншыя былі аддадзены ў салдаты [13]. Прафесары Іяахім Лялевель і Ігнат Даніловіч былі выключаны з Віленскага ўніверсітэта і пазбаўлены ўніверсітэцкіх пенсій [3]. У 1832 годзе царскі ўрад закрыў Віленскі ўніверсітэт, які больш 30 гадоў быў асяродкам ліберальнай думкі на Беларусі.

Па-рознаму склаўся лёс філаматаў і філарэтаў. У 1823 годзе *Ян Чачот* быў зняволены ў Віленскую турму, затым сасланы на Урал. Толькі праз 10 гадоў, цяжка хвораму паэту дазволілі вярнуцца ў Беларусь, дзе ён працягваў творчую працу, вывучаў фальклор. На працягу 1837–1846 гадоў сабраў і выдаў у Вільні 6 фальклорных зборнікаў «Сялянскія песні», напісаў кнігу «Аповесці для маладых дзяўчат» і іншыя. Памёр на 51 годзе жыцця [14, с. 467, 468]. *Юзаф Яжоўскі* пасля следства, у 1824 годзе з'ехаў у Расію, дзе працаваў настаўнікам, займаўся навуковай працай. У 1841 годзе вярнуўся на Украіну, працаваў хатнім настаўнікам [6, с. 288]. *Тамаш Зан* быў высланы ў Арэнбург, дзе прабыў 13 гадоў. У ссылцы аб'ездзіў Урал, знайшоў каля Самары нафту, у Зауральскім стэпе – багатыя паклады золата. У 1841 годзе вярнуўся на радзіму, дзе набыў маёнтак каля Оршы, займаўся літаратурнай дзейнасцю [14, с. 177]. Студэнт-юрыст *Адынец Антон* у 1823–1824 гадах быў у заключэнні, а затым у 1840–1859 гадах займаў пасаду рэдактара газеты «Виленский вестник» [3]. Філамат *Ігнат Дамейка,* ураджэнец Навагрудчыны, прымаў удзел у паўстанні 1830–1831 гадоў, пасля паражэння паўстання эмігрыраваў у Чылі, дзе яго выбралі рэктарам універсітэта горада Сант'яга. Вынікі навуковых пошукаў і адкрыццяў Дамейкі прынеслі яму сусветную вядомасць. Чылійцы высока ацанілі заслугі Дамейкі – яго імем названы адзін з партовых гарадоў (Пуэрта-Дамейка), у яго доме створаны музей, а ў Сант'яга пастаўлены помнік «Грандэ Эдукатару» (Вялікаму Асветніку) [14, с. 138–140).

Філамат *Восіп Кавалеўскі*, ураджэнец Гродзеншчыны, стаў акадэмікам Пецярбургскай акадэміі навук (1847), прафесарам (1834), знакамітым манголазнаўцам, у 1856–1860 гадах быў рэктарам Казанскага ўніверсітэта [14, с. 191, 192]. *Адам Міцкевіч* стаў сусветна вядомым паэтам.

**Заключэнне.** На прыкладзе тайных студэнцкіх арганізацый філаматаў паказана ўзнікненне і развіццё ліберальнай думкі ў Віленскім універсітэце ў пачатку XIX стагоддзя. Прадстаўнікі ліберальнай думкі на Беларусі – філаматы і філарэты – былі перадавымі людзьмі свайго часу, яны ўнеслі значны ўклад у навуку і культуру, у эканамічнае і культурнае развіццё не толькі свайго краю, але і іншых народаў і дзяржаў свету. Разам з тым грамадска-палітычныя погляды філаматаў і філарэтаў адпавядалі свайму часу – яны ўяўлялі будучае нашага краю толькі ў межах Рэчы Паспалітай. Філаматы і філарэты выступалі супраць дэспатызму (самадзяржаў'я), прыгоннага права, за развіццё народнай асветы, але як прадстаўнікі ліберальнай думкі вырашэнне грамадска-палітычных супярэчнасцей бачылі праз маральнае ўдасканаленне асобы, праз навуку і выхаванне.

Матэрыялы артыкула могуць прадстаўляць інтарэс для даследчыкаў ліберальнай думкі Беларусі ў дарэформенны перыяд, а таксама могуць быць выкарыстаны для падрыхтоўкі артыкулаў, дакладаў, паведамленняў, для распрацоўкі навуковых работ.

ЛІТАРАТУРА


1. Шалькевіч, В.Ф. Віленскі ўніверсітэт / В.Ф. Шалькевіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. Т. 2 ; рэдкал.: Б.І. Сачанка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭН, 1994. – С. 287–288.
2. Швед, В.В. Паміж Польшчай і Расіяй: грамадска-палітычнае жыццё на землях Беларусі (1772–1863 гг.) / В.В. Швед. – Гродна : ГрДУ, 2001. – 207 с.
3. Филоматы [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://ru.wikipedia.org/wiki/. – Дата доступа: 03.12.2015.
4. Чачот, Я. Пра будучае прызначэнне Таварыства філаматаў, пра варыянты яго сённяшняй будовы, пра тое, наколькі адпавядаюць яны нашым мэтам / Ян Чачот // Мысліцелі і асветнікі Беларусі : энцыкл. даведнік / Б.І. Сачанка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭН, 1995. – С. 640–646.
5. Мицкевич, А. Стихотворения. Поэмы / Адам Мицкевич. – М. : Худож. лит., 1979. – 350 с.
6. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. Т. 6, кн. 2 / рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭН, 2003. – 616 с.
7. Швед, В. Прамяністыя, Таварыства сяброў карыснай забавы / В. Швед // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. Т. 5 / рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭН, 1999. – С. 564–565.
8. Мохнач, Н.Н. От просвещения к революционному демократизму / Н.Н. Мохнач. – Минск, 1976.
9. Очерки истории философской и социологической мысли Белоруссии (до 1917 г.). – Минск, 1973. – 266 с.
10. Козел, А.А. Философская мысль Беларуси / А.А. Козел. – Минск : Амалфея, 2004. – 352 с.
11. Басюк, І.А. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі / І.А. Басюк. – Гродна : ГрДУ, 2011. – С. 173–174.
12. Лобойко, И.Н. Мои воспоминания. Мои записи / И.Н. Лобойко. – М. : Новое литературное обозрение, 2013. – 198 с.
13. История Вильнюсского университета. 1579–1979. – Вильнюс : Мокслас, 1979. – 104 с.
14. Асветнікі зямлі Беларускай: энцыкл. даведнік / рэдкал.: Г.П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск : БелЭН, 2001. – 496 с.


*Паступіў 09.01.2017*

**LIBERAL THOUGHT AT VILENSKY UNIVERSITY IN BEGINNING XIX OF CENTURY**

***I. BASIUK***

*In article origin and development of liberal thought at Vilensky university in beginning of century XIX considered. The purposes Are opened and program tasks of the liberal organisations first in Belarus – secret student's partnerships filomatov which (1817–1818) they acted at Vilensky university in 1817–1823 In the first period put before themselves the main things cultural and educational tasks, profound studying of sciences and moral enhancement of the person. In the second period (1818–1823) at filomatov there were political ideas, they condemned despotism (autocracy), the serfdom, supported exemption of peasants. They understood happiness of the person as dialectic interrelation public and private interests, as service to Fatherland. The future of Belarus saw in Rechi Pospolitoj borders (to its first section). As representatives of a liberal direction connected achievement of the purposes and tasks with moral enhancement of the person, by means of a science, education and education.*

***Keywords:*** *liberalism, secret societies, the right, despotism, freedom, the person, the serfdom, Rech Pospolitaja.*